

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №4 (12)
Люты 2021

## У нумары:

| | |
|---|---|
| **Навіны прафарыентацыі** | **Стар. 1** |
| **Тыдзень замежнай мовы** | **Стар. 2** |
| **Падведзены вынікі школьнага этапу раённага конкурсу дзіцячай творчасці “Выратавальнікі вачыма дзяцей”** | **Стар. 2** |
| **Рыцарскі турнір “Юныя абаронцы”** | **Стар. 3** |
| **Рэспубліканская акцыя “Адзіны дзень бяспекі”** | **Стар. 3** |
| **Шосты школьны дзень** | **Стар. 4** |

# Навіны прафарыентацыі

11 лютага нашу школу наведалі прадстаўнікі дзяржаўнай установы адукацыі "Абласны аграрна-тэхнічны прафесійны ліцэй": Зубава Любоў Мікалаеўна, майстар П.В. Сустрэча праходзіла з вучнямі 9 класа, якія стаяць на парозе свайго прафесійнага выбару.

З першых вуснаў будучыя выпускнікі даведаліся аб прафесіях, якія можна атрымаць у ліцэі, пра сам працэс навучання, аб магчымасцях далейшага прафесійнага росту.








# Тыдзень замежнай мовы



З 8 па 12 лютага ў школе праходзіў Тыдзень французскай мовы, у рамках якога настаўнікам французскай мовы Баркоўскай Г.І. для вучняў 3-9 класаў былі арганізаваны і праведзены разнастайныя мерапрыемствы: гульня "Знайдзі адрозненні" (Jeu des differences), віктарына "Што я ведаю пра Францыю?" (Quiz "Que sais-je de la France?"), конкурс чытачоў скарагаворак (Concours de la lecture des virelangues), конкурс знаўцаў французскай мовы "J'aime la langue française", конкурс малюнкаў "Les étoiles de Paris".

Усе ўдзельнікі атрымалі памятныя медалі, а самыя творчыя і актыўныя былі ўзнагароджаны дыпломамі.










# Падведзены вынікі школьнага этапу раённага конкурсу дзіцячай творчасці "Выратавальнікі вачыма дзяцей"

Галоўная задача конкурсу - не проста адлюстраваць здольнасці школьнікаў, але і сфармаваць у іх навыкі ўмелых дзеянняў у выпадку ўзнікнення надзвычайных сітуацый. У сваіх работах вучні вядуць размову аб найважнейшай праблеме нашага часу - бяспецы.

Па выніках праведзенага конкурсу навучэнцы ўзнагароджаны дыпломамі і граматамі. Лепшыя работы накіраваны для ўдзелу ў раённым этапе конкурсу "Выратавальнік1 вачыма дзяцей".









# Рыцарскі турнір “Юныя абаронцы”

Напярэдадні Дня абаронцы Айчыны ў нашай школы прайшло не зусім звычайнае мерапрыемства: рыцарскі турнір "Юныя абаронцы". У рыцарскіх выпрабаваннях прымалі ўдзел хлопчыкі 1-4 класаў, знаўцы правілаў ветлівасці і добрага тону, самыя лепшыя і самыя смелыя абаронцы дзяўчынак.

Першым конкурсам была "Размінка". Хлопчыкі адказвалі на пытанні, якія тычацца рыцараў. Затым была паэтычная гульня "Слоўнік ветлівых слоў". Хлопчыкам неабходна было ўспомніць самыя добрыя, ветлівыя словы. У трэцім конкурсе будучыным рыцарам трэба было пакланіцца і запрасіць на танец даму. Наступным было выпрабаванне на лепшую прычоску дзяўчынцы. У чарговым конкурсе хлопцам трэба было намаляваць танк з завязанымі вачыма. У канцы турніру хлопчыкі прамовілі клятву і былі прысвечаны ў Рыцары.

Мерапрыемства прайшло весела і заўзята. Усе ўдзельнікі атрымалі салодкія падарункі. Дзяўчынкі падаравалі юным абаронцам паштоўкі, выробленыя ўласнымі рукамі.








## Рэспубліканская акцыя “Адзіны дзень бяспекі”

У рамках правядзення рэспубліканскай акцыі "Адзіны дзень бяспекі» 22 лютага навучэнцы 5-9 класаў прагледзелі і абмеркавалі відэаролік "Правілы паводзін пры пажары ў школе". Акрамя таго, вучні вывучылі агульныя правілы паводзінаў і парадак дзеянняў пры пажары, праверылі свае веды ў вырашэнні тэставых заданняў па бяспецы жыццядзейнасці.

26 лютага была праведзена школьная лінейка бяспекі, прысвечаная правілам бяспечных паводзін вучняў у школе, на вуліцы, у хатніх умовах і на дарозе.





# Шосты школьны дзень

Шосты школьны дзень 27 лютага прайшоў пад знакам "Дня прафілактыкі дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму". У ходзе гэтага мерапрыемства навучэнцы 1-4 класаў паказалі свае веды правілаў дарожнага руху, удзельнічаючы ў тэматычнай віктарыне і гульнях. Вучні 1-9 класаў паглядзелі і абмеркавалі відэа-памятку для школьнікаў "Аб выкананні правілаў дарожнага руху".





Вучні 8-9 класаў прынялі ўдзел у раённай прафарыентацыйнай субоце "Шляхі атрымання прафесійнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь" у дыстанцыйным рэжыме. Навучэнцы атрымалі інфармацыйна-даведкавую кансультацыю аб парадку прыёму і навучання ў наступных установах адукацыі: "Вілейскі дзяржаўны каледж", "Капыльскі дзяржаўны каледж", "Маладзечанскі дзяржаўны політэхнічны каледж", "Мар'інагорскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж імя Е.В.Лабанка", "Мінскі дзяржаўны каледж электронікі", дзяржаўная ўстанова адукацыі "Абласны аграрна-тэхнічны прафесійны ліцэй ".





Самыя спартыўныя навучэнцы і запрошаныя госці прынялі актыўны ўдзел у спартландыі "Самы-самы", прымеркаванай да Дня абаронцы Айчыны.






Рэдкалегія: вучні 9 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 9 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 27 сакавіка.